УДК 7.077:792(510)

# МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ ЯК АБ'ЕКТ РЭФЛЕКСІІ І ФІКСАЦЫІ САЦЫЯЛЬНАГА ВОПЫТУ

**А. І. Смолік,**
*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца роля культуры, у тым ліку і мастацкай культуры, у фарміраванні каштоўнаснай арыентацыі індывіда. Адзначаецца, што месца мастацкай творчасці ў развіцці грамадства выклікала з'яўленне мноства меркаванняў у гуманітарным дыскурсе. Аналізуюцца погляды шэрагу айчынных асветнікаў наконт эстэтычнага ў мастацкай творчасці, асноўных крытэрыяў прыгажосці. Звяртаецца ўвага на неабходнасць глыбокага спасціжэння фальклору, які, на думку тагачасных мысліцеляў, з'яўляецца асноўнай умовай геніяльнасці ў мастацтве.

**Ключавыя словы:** культура, мастацтва, прыгажосць, фальклор, асветнікі, эстэтыка, дыскурс.

# ARTISTIC CULTURE OF BELARUS AS AN OBJECT OF REFLECTION AND FIXATION OF SOCIAL EXPERIENCE

**A. Smolik,**
*Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the role of culture, including artistic culture, in the formation of an individual's value orientation. It is noted that the place of artistic creativity in the development of society has caused the emergence of many opinions in the humanitarian discourse. The views of a number of Russian educators on the aesthetic in artistic creation, the main criteria of beauty are analyzed. Attention is drawn to the need for a deep understanding of folklore, which, according to the then thinkers, is the main condition for genius in art.

**Keywords:** culture, art, beauty, folklore, educators, aesthetics, discourse.

У сучасным грамадстве Рэспублікі Беларусь, у якім адбываецца сістэмная мадэрнізацыя, у матэрыяльна-вытворчай сферы разгортваюцца як сацыядынамічныя працэсы, так і важныя духоўныя пераўтварэнні. У сувязі з гэтым у якасці важнейшай задачы дзяржаўных і грамадскіх інстытуцый выступае забеспячэнне ўстойлівага развіцця культуры, паколькі яна з'яўляецца ключавым фактарам духоўнай абароненасці нацыі.

Вялікая роля ў фарміраванні ўнутранага свету асобы належыць мастацкай культуры. На ўсіх этапах культурагенезу яе значэнне вымяралася эфектыўнасцю ўздзеяння на маральнае самасцвярджэнне чалавека, свядомае ўвасабленне духоўных арыенціраў грамадства. Мастацкая культура ў гуманітарным дыскурсе трактуецца як шматгранны працэс і вынік эстэтычнага пераўтварэння сферы чалавечай жыццядзейнасці, на якой замыкаецца ўся сацыядынаміка эстэтычных і мастацкіх каштоўнасцей. Французскі культуролаг А. Моль, ацэньваючы велізарнае яе значэнне, адзначаў, што «не существует иной ценности, кроме самой культуры, что человек в обществе не имеет другого значения, кроме той роли, которую он играет в коллективном прогрессе человечества» [3, с. 19]. Такі высокі статус культуры абумовіў узнікненне розных канцэптуальных падыходаў да выяўлення сутнасці мастацкай творчасці. Так, ужо ў XVIII ст. асветнікі Беларусі шмат увагі надавалі вызначэнню сутнасці, зместу, форм і механізмаў мастацкай культуры.

М. Пачобут-Адляніцкі сцвярджаў, што мастацтва павінна быць вечным узорам для пераймання, што яно заклікана выхоўваць любасць да добрых спраў [4, с. 273]. Б. Дабшэвіч увёў у навуковы ўжытак паняцце «эмацыянальная эвідэнцыя», якая, на яго думку, асабліва патрэбная ў мастацкай творчасці. Галоўным для мастака, лічыў ён, павінны быць дакладнасць, адавочнасць створанага [4, с. 206]. Да эстэтычных аспектаў мастацкай культуры неаднойчы ў сваіх працах «Аб літаратуры», «Аб творах класіцызму і рамантызму» звяртаўся вядомы беларускі філосаф-асветнік Я. Снядзецкі. Мысліцель падкрэсліваў значэнне розуму і праўды ў мастацтве, гаварыў аб неабходнасці глыбіні думкі і ўсебаковай адукацыі творцы. У яго поглядах на мастацкую творчасць і прыгожае своеасабліва спалучаліся матывы класічнай эстэтыкі і дамінантныя ідэі асветніцкай парадыгмы. Я. Снядзецкі, прытрымліваючыся сэнсуалісцкіх ідэй, у сваіх меркаваннях аб сутнасці мастацтва і эстэтычнага пераконваў, што «тое прыгожае ў мастацтве, што з'яўляецца добрасумленным і вечным, што заснавана на праўдзе, ці, як мы прывыклі гаварыць, адпавядае прыродзе» [10, с. 106].

Асобныя пытанні эстэтычнага ў мастацтве закраналіся ў трактатах Ф. Галянскага, Я. Фалькоўскага, Г. Каніскага. Гэтыя аўтары займалі кампрамісную пазіцыю паміж нарматыўнай эстэтыкай класіцызму і новымі ідэаламі асветніцтва. Важнейшыя паняцці эстэтыкі яны тлумачылі ў адпаведнасці з класічнымі традыцыямі: прыгожае – мера і гармонія, тое, што адпавядае магчымасцям успрыняцця; узвышанае – тое, што не можа быць ахоплена нашым зрокам і слыхам [5, с. 286].

Арыгінальныя і глыбокія думкі наконт эстэтычнага ў мастацкай творчасці выказваў у сваіх трактатах С. Маймон. Як і І. Кант, ён адстойваў суб'ектыўны характар успрыняцця прыгожага і аб'ектыўныя перадумовы агульнага меркавання аб ім. Асноўнымі крытэрыямі прыгажосці, сцвярджаў філосаф, з'яўляюцца гармонія і сіметрыя [2, с. 391–393].

Да праблем мастацкай культуры звяртаўся і А. Доўгірд. Прызнаючы адчуванне першасным актам успрыняцця, ён даказваў, што прафесіяналізм у мастацкай творчасці звязаны з паступовым набыццём аўтаматызму ў навыках і адчуваннях. На яго погляд, музыкант тым лепей здольны перадаць прыгожае ў музыцы, чым больш віртуозная яго выканальніцкая тэхніка [7, с. 404].

У XIX ст. узмацняецца працэс адраджэння беларускай нацыянальнай культуры, што спрыяла развіццю мастацкай культуры. У тагачасным перыядычным друку ўсё часцей пачалі з'яўляцца крытычныя артыкулы аб музычнай і тэатральнай творчасці, аналізавалася выканальніцкае майстэрства акцёраў. Так, псеўдакласіцызм, у тым ліку і яго эстэтыка, асэнсоўваўся ў шэрагу публікацый вядомага фалькларыста Р. А. Падбярэзскага. У іх ён аналізаваў творы А. Абрамовіча, Я. Баршчэўскага, Т. Лады-Заблоцкага, А. Рыпінскага і інш. Аўтар меркаваў, што глыбокае спасціжэнне фальклору з'яўляецца асноўнай умовай геніяльнасці ў музыцы. Менавіта ў народным меласе знакамітыя кампазітары свету, пераконваў Р. А. Падбярэзскі, знаходзілі матэрыял для сваіх шэдэўраў. У якасці прыкладу навуковец прыводзіў творы еўрапейскіх кампазітараў-рамантыкаў, якія выкарыстоўвалі багацейшыя крыніцы народнай музыкі. Крытык увесь час накіроўваў увагу айчынных кампазітараў і выканаўцаў на народную творчасць: «Які б геніяльны мастак ні быў, ён не створыць такой свабоднай мелодыі, як чалавек прыроды ў час натхнення» [9, с. 23–24]. Важнейшай умовай поспеху кампазітара Р. А. Падбярэзскі лічыў непасрэднасць, раскаванасць, свабоду ад усялякіх правілаў і норм у мастацкай творчасці.

Значны ўнёсак у развіццё тэорыі мастацкай творчасці зрабіў П. В. Шпілеўскі. У сваіх крытычных артыкулах, змешчаных у расійскіх часопісах і газетах («Пантеон», «Современник», «Театральный и музыкальный вестник», «Минские губернские ведомости»), ён быў вельмі патрабавальным да выканальніцкага майстэрства артыстаў, аддаючы перавагу пераўвасабленню, натуральнай манеры выканання. Разам з чыста прафесійнымі пытаннямі П. В. Шпілеўскі ўздымаў праблему грамадскай ролі мастацкай культуры, падкрэсліваючы яе асветніцкую і выхаваўчую функцыю [6, с. 432–435].

Музычна-эстэтычныя веды ў Беларусі ў XIX ст. фарміраваліся ў першую чаргу творцамі, а таксама аўтарамі спецыяльных тэарэтычных даследаванняў мастацкай творчасці. Пераважная большасць такіх работ уяўляла сабой практычныя вучэбныя дапаможнікі з ярка выражанай асветніцкай накіраванасцю. Напрыклад, праца А. Варанца «Начала музыки как фигурального, так и хорального пения» (1859). У ёй прадстаўлены асноўныя звесткі па тэорыі музыкі, утрымліваюцца каштоўныя метадычныя ўказанні для выканаўцаў, слоўнік музычных тэрмінаў [1]. Да такога тыпу работ адносіцца, на наш погляд, праца Я. Д. Голанда «Академический трактат об истинном искусстве музыки», у якой важнейшыя палажэнні заходнееўрапейскай музычнай эстэтыкі спалучаюцца з пытаннямі агульнай музычнай тэорыі. Рацыяналістычныя ідэі наконт геніяльнасці творцы ўтрымліваюцца ў «Письмах о музыке» кампазітара-аматара М. Кл. Агінскага. Ён лічыў, што «гений творца существует по правилам теории искусства, мало кому, впрочем, известным до глубины» [8, с. 70]. М. Кл. Агінскі спрабаваў растлумачыць спецыфіку ўспрыняцця чалавекам музычнага мастацтва, выявіць, чым абумоўлены неадназначнасць і варыятыўнасць разумення слухачамі музычнага твора.

Такім чынам, працы айчынных асветнікаў XVIII–XIX стст., на нашу думку, з'яўляюцца арыгінальным помнікам музычна-эстэтычнай рэфлексіі, самабытнай з'явай у мастацкай культуры Беларусі і не страцілі сваёй актуальнасці ў наш час.

1. *Варанец, А. А.* Пачаткі музыкі як фігуральных, так і харальных спеваў / А. А. Варанец // Тэорыя харальных спеваў на Беларусі / Т. У. Ліхач. – Мінск, 1999. – С. 175–195.

2. *Майман, С.* Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі / С. Майман // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избр. произведения XVI – начала XIX в. – Минск, 1962. – С. 391–393.

*3. Моль, А.* Социодинамика культуры / А. Моль. – М. : Прогресс, 1973. – 406 с.

*4.* Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с.

*5.* Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). – Минск : Наука и техника, 1973. – 560 с.

*6. Шпилевский, П.* Спектакли любителей и разные концерты в Минске / П. Шпилевский // Театрал. и муз. вестн. – 1859. – № 44. – С. 432–435.

*7. Dowgird, A.* Wyklad przyrodzonych meslenia prawidel czeyl Logika teoretyczna i prakteczna / A. Dowgird. – Polock, 1828.

*8. Ogiński, M. K.* Listy o muzyce / M. K. Ogiński // oprac.: T. Strumillo; red. A. Papierzowa. – Kraków : Pol. Wyd – Muz., 1956. – 135 s.

*9. Podberecki, R.* Antoni Abramowicz – muzyk / R. Podberecki // Rocznik Literacki. – Petersburg, 1844. – T. 3. – P. 76-93.

*10. Sniadeski, J.* Pisma filozoficzne / J. Sniadeski. – Krakow : PWM, 1958. – T. 2. – 268 p.